дследаванняў, значна пашырыліся магчымасці і колькасць здабытай інфармацыі. Зараз адказаць на пытанне пра храналогію можна не толькі дзякуючы выяўленню на помніку нумізматычных матэрыялаў, як гэта было ў XIX ст., але і дзякуючы існаванню распрацаваных «тыпалагічна-хрананалагічных» класіфікацый.

Ля вытокаў сучасных падыходаў да пошуку адказаў на праблемныя навуковыя пытанні ў археалогіі стаялі прадстаўнікі «памешчыцкага этапу». Некаторыя з даследчыкаў зрабілі значны ўклад у развіццё сучаснай археалогіі, некаторыя з прадстаўнікоў гэтага перыяду зусім не займаліся асэнсаваннем таго, што імі было зроблена, і пакінулі пра сваю дзейнасць толькі кароткія ўзгадкі ў літаратуры. Аднак менавіта імі быў пакладзены старт назапашванню матэрыялаў для рэканструкцыі жаночага строю насельніцтва Беларускага Падзвіння другой паловы VIII – пачатку XI ст. А праз аналіз жаночага строю і яго асобных элементаў, можна даць адказ на пытанні, якія цікавілі як даследчыкаў XIX ст., так і сучасных археолагаў: этнас, сувязі, арэал, храналогія.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Кахаоўскі Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. Мінск : Навука і тэхніка, 1984.
2. Плавінскі М. А., Плавінскі А. М., Плавінскі У. А., Тарасевіч В. М.,. Макоўская В. А, Астаповіч Э. А. Даследаванні комплекса археалагічных помнікаў каля вёскі Наўры Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў 2017 годзе // Сахаровские чтения 2018 года: экологические проблемы XXI века: материалы 18-й международной научной конференции, Мінск, 17–18 мая 2018 г., в 3 ч. 2018. Ч. 1. С. 94–95.
3. Покровский В. Ф. Курганы на границе современной Литвы и Белоруссии // Труды IX археологического съезда в Вильне. 1895. Т.1. С. 166–220.
4. Покровский Ф. В. Археологическая карта Ковенской губернии. Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1899.
5. Сементовский А. М. Белорусские Древности. СПб., 1890.
6. Тышкевич Я. П. О древних могилах в Минской губернии и Литве // Сын Отечества: журнал истории, политики, словесности, наук и художеств. 1838. Т. 6. С. 51–58.
7. Pławinski M., Pławinski A., Pławinski U., Tarasiewicz W., Makouskaja W., Astapowicz E. Badania zespołu stanowisk archeologicznych koło wsi Nawry, rej. miadzielski obw. Miński, w 2017 roku // Badania archeologiczne w Polsce środkowowschodniej, zachodniej Białorusi i Ukrainie w roku 2017: streszczenia referatów XXXIV konferencji. 2018. S. 38.
8. Tyszkiewicz E. Badania archeologiczne nad zabytkami przedmiotow sztuk i rzemiosl i t.d. w dawnej Litwe i Rusi Litewskiej. Wilno, 1850.
9. Tyszkiewicz K. O kurhanach na Litwie i Rusi zachodniej. Berlin, 1868.


УДК 94"1914/1918":008(476)

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ МЕСЦАЎ ПАМЯЦІ Ў КАНТЭКСЦЕ КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТА ПОЛЯ БІТВЫ

**А. Дз. Якубінская**

*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт,*

*пр. Незалежнасці, 65, 220013, г. Мінск, Беларусь;* alesia-78@yandex.ru

Культурны ландшафт – гэта асаблівы тып спадчыны, што забяспечвае ўзаемадзеянне, узаемапранікненне і ўзаемазалежнасць прыродных і культурных кампанентаў. Воінскія пахаванні Першай сусветнай вайны ўвасабляюць ў сабе традыцыйныя рысы сакральных тэрыторый асацыятыўнага культурнага ландшафту сельскай мясцовасці паўночна-заходняй Беларусі. Воінскія некропалі Мядзельскага раёна дазваляюць ажыццявіць аб'ектывацыю падзей Нарацкай аперацыі 1916 года.

***Ключавыя словы:*** асацыятыўны культурны ландшафт; воінскія некропалі; Мядзельскі раён; Нарацкая аперацыя.

# ИНТЕРПРЕТАЦИЯ МЕСТ ПАМЯТИ В КОНТЕКСТЕ КУЛЬТУРНОГО ЛАНДШАФТА ПОЛЯ БИТВЫ

**А. Д. Якубинская**

*Белорусский национальный технический университет,*
*Пр. Независимости, 65, 220013, г. Минск, Беларусь; alesia-78@yandex.ru*

Культурный ландшафт – это особенный тип наследия, который обеспечивает взаимодействие, взаимопроникновение и взаимозависимость природных и культурных компонентов. Воинские захоронения Первой мировой войны несут в себе традиционные черты сакральных территорий ассоциативного культурного ландшафта сельской местности северо-западной Беларуси. Воинские некрополи Мядельского района позволяют осуществить объективацию событий Нарочской операции 1916 года.

***Ключевые слова:*** ассоциативный культурный ландшафт; воинские некрополи; мядельский район; Нарочская операция.

# INTERPRETATION OF MEMORY PLACES IN THE CONTEXT OF THE CULTURAL LANDSCAPE OF THE BATTLE FIELD

**A. D. Yakubinskaya**

*Belarusian National Technical University,*
*Niezavisimosti Ave., 65, 220013, Minsk, Belarus; alesia-78@yandex.ru*

Cultural landscape is a special type of heritage that provides interaction, interpenetration and interdependence of natural and cultural components. The military burial places of the First World War carry the traditional features of the sacred territories of the associative cultural landscape of the countryside of northwestern Belarus. The military necropolises of the Myadel district make it possible to objectify the events of the Naroch operation of 1916.

***Key words:*** associative cultural landscape; military necropolises; Myadel district; Naroch operation.

Культурная спадчына з’яўляецца своеасаблівай сістэмай, у якой асобныя аб’екты не могуць быць захаваныя без сувязі паміж імі ці па-за межамі навакольнага асяроддзя. Культурны ландшафт – асноватворная катэгорыя спадчыны, што адлюстроўвае гуманістычную прыроду грамадства праз адзінства і ўзаемадзеянне мноства культурных і прыродных каштоўнасцей (Культурный ландшафт как объект наследия / Ю. А. Веденин [и др.] Москва : Институт наследия, 2004. 620 с.). Культурны ландшафт рэпрэзентуе нацыянальную самасвядомасць народа, традыцыйны лад жыцця. Такім чынам, культурны ландшафт – гэта асаблівы тып спадчыны, што забяспечвае ўзаемадзеянне, узаемапранікненне і ўзаемазалежнасць прыродных і культурных кампанентаў.

Асаблівы тып культурнага ландшафту гэта асацыятыўны ландшафт. У асацыятыўным ландшафце ў якасці носьбітаў інфармацыі выступаюць помнікі матэрыяльнай культуры, у тым ліку памятныя і сакральныя месцы (Культурный ландшафт как объект наследия. С. 73). Яго істотная рыса – гэта гісторыка-культурная самакаштоўнасць і інфарматыўнасць, пры захаванні рытмікі прыродных працэсаў. Важным тут з’яўляецца наяўнасць сведкаў – знакі-сімвалы, помнікі, айконімы, семантычныя сведчанні (паданні), што нагадваюць пра гісторыка-культурную значнасць месца. З’яўляючыся часткай культурнага ландшафта, могільнікі адлюстроўваюць сакральнае запаўненне мясцовасці. Воінскія пахаванні Першай сусветнай вайны з’яўляюцца не толькі мемарыяламі памяці, але і своеасаблівымі сімваламі прымірэння, і як аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны воінскія некропалі і Рускай імператарскай арміі, і Германскай імперскай арміі з’яўляюцца роўназначнымі. Таму воінскія пахаванні, як своеасаблівыя месцы памяці, здольныя захаваць, адрадзіць і сфарміраваць памяць аб вайне ў сучасным грамадстве. Такім чынам, воінскія некропалі ўвасабляюць ў сабе асноўныя традыцыйныя рысы сакральных тэрыторый культурнага ландшафту сельскай мясцовасці паўночна-заходняй Беларусі як выключна рэпрэзентатыўныя яго ўдзельнікі. У гэтым унікальная каштоўнасць культурнага ландшафту Мядзельскага раёна.

Поле бітвы – гэта складаны і разнастайны аб’ект культурнай спадчыны. Поле бітвы – гэта ваенна-гістарычны, асацыятыўны, культурны ландшафт: ваенны па паходжанні і функцыянальным прызначэнні, гістарычны і асацыятыўны па інфармацыйным змесце, культурны па асаблівым узаемадзеянні чалавека і прыроды, бо створаны мэтанакіравана. Месцы пахаванняў з’яўляюцца матэрыяльнымі слядамі бітвы. Пахаванне астанкаў загінуўшых воінаў суправаджаецца з’яўленнем магіл і першых памятных знакаў на іх. Пасля бітвы праз некаторы час ландшафт змяняецца, становіцца блізкім да першапачатковага, але поўнасцю ён не аднаўляецца, хаця б таму, што з’яўляюцца новыя аб’екты – магілы загінуўшых (памерлых) воінаў. Большасць воінскіх пахаванняў ў Мядзельскім раёне Мінскай вобласці з’явілася вясной 1916г., бо адной з самых драматычных падзей Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі сталася наступленне вайсковых частак Рускай імператарскай арміі вясной 1916 г. у раёне возера Нарач, якое ў гістарычнай літаратуры атрымала назву Нарацкая аперацыя. Тэрміны правядзення аперацыі 18 (5) – 30 (17) сакавіка 1916 года. Згодна з афіцыйна апублікаванымі дадзенымі людскія страты 2-й арміі склалі 77427 салдат і 1018 афіцэраў (чвэрць асабовага саставу арміі да пачатку аперацыі), людскія страты нямецкага боку дакладна не высветлены і ацэньваюцца прыкладана ў трыццаць – сорак тысяч чалавек (Смольянинов М. М. Нарочская операция Первой мировой войны // Беларусь у гады Першай сусветнай вайны: матэр. міжнар. навук.-практ. канф. / навук. рэд. А.М. Літвін, У.В. Ляхоўскі. Мінск : Чатыры чвэрці, 2009. С. 313-322). Такім чынам, у ходзе Нарацкай аперацыі з’явіліся воінскія некропалі, якія ад пачатку і назаўжды звязаныя з прыроднымі элементамі ландшафта ў выглядзе асаблівых адбіткаў, матэрыяльных слядоў Першай сусветнай вайны.

Паводле апошніх апублікаваных звестак, у Мядзельскім раёне Мінскай вобласці дакладна вызначана 25 месцаў воінскіх пахаванняў (Битва у Нарочи, 1916. Немецкие источники о русском весеннем наступлении (Нарочская операция) / [авт. текста, сост. В. А. Богданов]. Брест: Полиграфика, 2016. 376 с.). З іх 10 брацкіх магіл воінаў Рускай імператарскай арміі (месцы двух з іх дакладна не вызначаны, сустракаюцца ў гістарычных крыніцах) і адно індывідуальнае пахаванне; 18 месцаў пахаванняў нямецкіх салдат і афіцэраў (з іх у крыніцах ёсць звесткі пра два месцы пахаванняў, воіны яшчэ з двух месцаў перапахаваны, таксама захаваліся лакальныя ўспаміны аб адным могільніку); 2 некропалі са змешанымі пахаваннямі. У адпаведнасці з дадзенымі аб размяшчэнні 2-й арміі можна меркаваць, што ў брацкіх магілах рускіх воінаў і на змешаным некропалі верагодна пахаваны салдаты 5-га, 6-га, 7-га, 8-га, 29-га, 35-га, 36-га Сібірскага стралковага палка, 28-га Полацкага, 26-га Магілёўскага палка, 37-га Екацярынбургскага, 39-га Томскага, 169-га Нова-Трокскага палка, 111-га Данскога палка, 267-га Духаўшчынскага пяхотных палкоў, 10-й артылерыйскай брыгады і іншыя (Битва у Нарочи, 1916. С. 328–358). Воінаў Рускай імператарскай арміі, якія загінулі (памерлі) падчас баявых дзеянняў, незалежна ад веравызнання хавалі згодна з праваслаўным пахавальным абрадам, над магіламі ўсталёўвалі драўляныя крыжы. Абавязкамі мясцовых святароў была праца па ўладкаванні брацкіх могільнікаў і будаўніцтва памінальных капліц.

Месцы пахаванняў воінаў Рускай імператарскай арміі маюць агульныя рысы. Па-першае, магілы рускіх салдат лакалізаваны ў большасці ва ўсходнім накірунку ад возера Нарач. Гэта магілы ў вёсках Чарэмшыцы, Вузла, Княгінін, Брусы, Баяры, Мінчакі, Навасёлкі. Па-другое, амаль усе месцы пахаванняў абазначаны як брацкія магілы, што дае некаторыя падставы лічыць, што воіны маглі загінуць у кароткі прамежак часу, падчас актыўных баявых дзеянняў вясной 1916 г. Па-трэцяе, з вялікай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што колькасць пахаваных воінаў вызначана прыблізна, у большасці брацкіх магіл пахавана больш за сто загінуўшых. Так, на помніку ў Чарэмшыцах адзначана, што там пахавана 700 рускіх салдат, на грамадзянскім могільніку ў в. Вузла пахавана 45 воінаў, на грамадзянскім могільніку ў в. Княгінін 2500 воінаў, за 300 м на паўночны ўсход ад в. Брусы ў брацкай магіле пахавана 400 воінаў, на могілках у Навасёлках пахавана каля 100 воінаў, на могілках у в. Мінчакі пахавана 100 воінаў, якія памерлі ў шпіталі пасля ранення ў 1916 г., ля в. Баяры колькасць пахаваных воінаў на помніку не адзначана. Па-чацвертае, на

большасці месцаў пахаванняў усталяваны мемарыяльныя помнікі, якія ўяўляюць сабой вялікія камяні з прымацаванымі да іх шыльдамі з надпісамі на рускай мове прыкладна аднолькавага зместу: указана колькасць пахаваных рускіх салдатаў, што загінулі падчас Першай сусветнай вайны ў ходзе Нарацкай аперацыі 1916 г. Па-пятае, на большасці мемарыяльных помнікаў прозвішчы і імёны загінуўшых адсутнічаюць і магілы безымянныя.

Некаторыя некропалі рускіх воінаў маюць шэраг асаблівасцяў. Так, на некропалі ля вёскі Баяры ўсталяваны металічны крыж, абнесены металічнай агароджай і вялікі камень. Мемарыяльная пліта мае надпіс на беларускай мове, у якім адзначана, што месца пахавання ўладкавана мясцовым жыхаром А.С. Бляяўскім (1990-я гг.). Слова "Першая" напісана з вялікай літары. Ля некропаля ў в. Навасёлкі знаходзіцца адзінкавае пахаванне мясцовай жыхаркі Алены Берняковіч, датаванае 1985 годам. На некропалі ля в. Чарэмшыцы 52-ім пошукавым батальёнам усталяваны драўляны крыж на падставе, якая ўпрыгожана георгіеўскай стужкай. Адноўленая раней таблічка з надпісам "Не шумите сосны зеленыя, не будите вы славныхъ героев" адсутнічае. На шэрагу брацкіх магіл рускіх воінаў мемарыяльныя знакі былі ўстаноўлены яшчэ ў савецкі перыяд. На брацкіх магілах ў вёсках Брусы, Чарэмшыцы і Вузла мемарыяльныя помнікі былі ўсталяваны пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны мясцовымі органамі ўлады, на самай вялікай ў Мядзельскім раёне брацкай магіле ў в. Княгінін у канцы 1980-х гадоў з ініцыятывы прыватных асоб і мясцовай адміністрацыі на грамадзянскім могільніку быў усталяваны мемарыяльны знак (Битва у Нарочи, 1916. С. 340–358). Слова "первая" напісана з малой літары. Брацкія магілы ў вёсках Брусы, Вузла, Княгінін атрымалі статус помнікаў гісторыі і культуры Беларусі яшчэ ў 1987 г. (Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1987. Кн. 2). Далучэнне брацкіх магіл рускіх салдат 1916 г., што знаходзяцца ля вёсак Брусы, Вузла, Чарэмшыцы, да Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь было зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 578 ад 14 мая 2007 г., згодна з ёй брацкім магілам нададзены статус гісторыка-культурных каштоўнасцей рэгіянальнага значэння (Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. Мінск : БЕЛТА, 2009).

На тэрыторыі Мядзельскага раёна дакладна вядома 13 некропаляў салдат і афіцэраў Германскай імперскай арміі, якія знаходзяцца ў в. Буйкі (2 пахаванні), в. Варашылкі, п. Засвір, в. Ідоліна, в. Карабаны, в. Калодна, в. Канстанцінава, курортным пасёлку Нарач, в. Пронькі (3 пахаванні). На некропалях германскіх салдат і афіцэраў пахаваны воіны XXI армейскага корпуса, 250-га, 266-га рэзервовага пяхотнага палка, 75-й, 80-й рэзервовай дывізіі і іншыя.

Некропалі германскіх воінаў маюць агульныя і адметныя рысы. Па-першае, магілы германскіх салдатаў у асноўным лакалізаваны на заходнім накірунку ад возера Нарач. Па-другое, германскія некропалі маюць індывідуальныя надмагільныя пліты, на многіх з іх чытаюцца надпісы пераважна на польскай мове. На тэрыторыі Беларусі надмагільныя надпісы на тыпавых помніках (стылізаваных ці вертыкальных крыжах) выбіты пераважна на польскай мове, але сустракаюцца надпісы і эпітафіі на нямецкай, асабліва, калі гэта індывідуальны помнік ці пахаваны афіцэр. Па-трэцяе, большасць нямецкіх некропаляў маюць агароджу ў выглядзе бетонных слупоў (дзе-нідзе з металічнымі ланцугамі), на якіх выбіты крыжы, а таксама ўмацаваныя каменнем земляныя валы (пахаванні ў в. Пронькі, п. Засвір, в. Карабаны, в. Буйкі, в. Канстанцінава). Па-чацвёртае, на пяці некропалях усталяваны металічныя ці драўляныя крыжы, помнікі, памятныя пліты. Так, на воінскім некропалі ў в. Буйкі ўсталяваны металічны крыж і памятная пліта. У цэнтры воінскага некропаля ў п. Засвір знаходзіцца група з трох металічных крыжоў і чыгунная памятная пліта. У в. Карабаны часткова захаваўся ўнікальны помнік-выява нямецкага салдата, які трымае ў руках апушчаны меч і шчыт. У в. Канстанцінава ўсталяваны дубовы крыж, які некалькі разоў падымалі і ўмацоўвалі мясцовыя жыхары. У курортным пасёлку Нарач захавалася індывідуальнае нямецкае пахаванне, на якім усталяваны помнік з

эпітафіяй на нямецкай мове. На паўночна-ўсходнім ускрайку в. Пронькі ў цэнтральнай частцы некропаля знаходзіцца каменны помнік з надпісам на нямецкай мове: «Героям 80-й рэзервовай дывізіі» і вялікі металічны крыж з памятнай чыгуннай плітой. На паўднёва-заходнім ускрайку в. Пронькі ў цэнтры некропаля размешчаны адрэстаўраваны Народным саюзам Германіі масіўны помнік з надпісам на нямецкай мове: «Героям 250-га рэзервовага пяхотнага палка», датаваны 1916 г. Тэрыторыя воінскіх некропаляў, што знаходзяцца ў межах грамадзянскіх могільнікаў, часта занятая больш познімі пахаваннямі мясцовых жыхароў, напрыклад, некропаль у в. Карабаны. Для індывідуальных помнікаў і надмагільных пліт характэрна выява апушчанага мяча або мяча перакрыжаванага з лаўровай галінкай.

На тэрыторыі Мядзельскага раёна знаходзіцца 2 змешаных пахавання, якія маюць асаблівыя рысы. Страчаны рускія пахаванні на змешаным некропалі ля в. Лотва (Битва у Нарочи, 1916. С. 342). У аграгарадку Нарач у цэнтральнай частцы старога каталіцкага цвінтару знаходзіцца змешаны некропаль, на якім пераважаюць пахаванні нямецкіх салдат, захавалася некалькі рускіх. Наяўнасць змешаных пахаванняў сведчыць аб тым, што абодва бакі выконвалі нормы міжнароднага гуманітарнага права па пытаннях пахавання загінуўшых ваеннаслужачых у залежнасці ад занятай імі ў выніку баёў тэрыторыі. На гэтым некропалі ўсталяваны пастамент, вышынёй прыкладна 4 метры, на вяршыні якога фігура арла, што раскінуў крылы, на барэльефе ёсць выява мяча і лаўровай галінкі, захаваўся надпіс на нямецкай мове: «У гонар і памяць героям, паўшым за сваю Айчыну. XXI армейскі корпус». Вакол пастамента складзены крыжы, якія захаваліся ад страчаных пахаванняў, бо хаця ўчасткі некропаля і агароджаны каменнымі слупамі, але яны блізка прымыкаюць да грамадзянскіх пахаванняў, якія нібы паглынаюць вайсковыя. У Кабыльніках (сёння аграгарадок Нарач) Мядзельскага раёна знаходзіўся штаб германскага корпуса, захавалася царква, якая была ўладкавана пад нямецкі лазарэт, таму пахаванні тут датуюцца 1916–1917 гг.

Такім чынам, рускія і германскія воінскія пахаванні на тэрыторыі Мядзельскага раёна маюць агульныя рысы. Па-першае, пахаванні абодвух бакоў з’явілася ў прыфрантавой паласе, пры шпіталях, на сельскіх ці гарадскіх могільніках амаль адначасова ці за кароткі тэрмін, калі забітых (памерлых ад атрыманых раненняў) хавалі неўзабаве пасля баявых дзеянняў. Па-другое, адметная рыса воінскіх пахаванняў перыяду Першай сусветнай вайны – наяўнасць змешаных некропаляў. Па-трэцяе, індывідуальныя надмагіллі захаваліся пераважна на нямецкіх ці змешаных некропалях. Па-чацвёртае, над безымяннымі магіламі, якія знаходзяцца на нямецкіх ці змешаных некропалях, таксама ўсталяваны тыпавыя помнікі з надпісамі на польскай мове: «невядомы нямецкі салдат» ці «невядомы рускі салдат». Па-пятае, да сённяшняга дня большасць аб’ектаў не маюць ахоўнага статусу, бо, за выключэннем трох брацкіх магіл рускіх воінаў, яны не ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, культурны ландшафт з’яўляецца своеасаблівым падручнікам гісторыі, а сто год – гэта храналагічны прамежак, у рамках якога адбываецца аб’ектывацыя рэальных падзей Нарацкай аперацыі ў выглядзе воінскіх некропаляў – неад’емных элементаў культурнага ландшафту Мядзельскага раёна.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Битва у Нарочи, 1916. Немецкие источники о русском весеннем наступлении (Нарочская опера-ция) / [авт. текста, сост. В. А. Богданов]. Брест: Полиграфика, 2016.

2. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. Мінск : БЕЛТА, 2009.

4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / Акадэмія навук БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1987. – Кн. 2.

5. Культурный ландшафт как объект наследия / Ю. А. Веденин [и др.] / под ред. Ю. А. Веденина, М. Е. Кулешовой. Москва: Институт наследия, 2004.
6. Смольянинов, М.М. Нарочская операция Первой мировой войны // Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Смаргоншчына: трагедыя, гераізм, памяць: матэр. Міжнар. навук.-практ. канф. (Смаргонь, 18-19 мая 2007 г.) / навук. рэд. А.М. Літвін, У.В. Ляхоўскі ; рэдкал.: М.У. Мяснiковіч [і інш.]. Мінск : Чатыры чвэрці, 2009. С. 313-322.